# 24 сонечныя перыяды: Зіма

Тэкст Гао Чуньсян, Шао Мінь    Ілюстрацыі Сю Мінчжэнь, Лі Цзын



CIPG
中国国际出版集团
海豚出版社





## Песня сонечных перыядаў

Вясной[1] дождж[2] абуджаецца[3], вясенні[4] чысты[5] дождж[6].
Летам[7] збожжа[8] каласіцца[9], наліваецца ў летнюю[10] спёку[11].
Восенню[12] спёка[13] сціхае, час восеньскіх[15] росаў[16] ды шэрані[17].
Зімой[18] снежнай[19], вельмі снежнай[20], час зімовых[21] халадоў[22].

---

1 Пачатак вясны  2 Дажджавая вада  3 Абуджэнне насякомых  4 Вясенняе раўнадзенства
5 Чыстае святло  6 Хлебны дождж  7 Пачатак лета  8 Наліўное збожжа  9 Каласаванне хлябоў
10 Летняе сонцастаянне  11 Малая спёка і Вялікая спёка  12 Пачатак восені  13 Спад спёкі
14 Белыя росы  15 Восеньскае раўнадзенства  16 Халодныя росы  17 З'яўленне шэрані
18 Пачатак зімы  19 Малы снег  20 Вялікі снег  21 Зімовае сонцастаянне 22 Малы холад і Вялікі холад

Lovely China

First original geographical picture books in China

# 24 СОНЕЧНЫЯ ПЕРЫЯДЫ: ЗІМА

Тэкст Гао Чуньсян, Шао Мінь Ілюстрацыі Сю Мінчжэнь, Лі Цзын



Мінск
«Новое знание»
2021

海豚出版社
DOLPHIN BOOKS
CIPG 中国国际出版集团

УДК 087.5:502
ББК 20.1
Г19



Існуе чатыры пары года. Старажытныя кітайцы падзялілі іх на 24 сонечныя перыяды, кожны з якіх адлюстроўвае адметную фазу сезонных зменаў. Сонечныя перыяды не толькі падказваюць, што трэба рабіць землярobам, але і дапамагаюць кожнаму з нас прадбачыць змены надвор'я.

Гэта кніга апавядае гісторыю дзяўчынкі Яі, якая наведвае сваіх бабулю і дзядулю ў вёсцы і назірае, як 24 сонечныя перыяды паступова змяняюць адзін аднаго на працягу года. Разам з Яяй вы трапіце на традыцыйныя кітайскія святы, даведаецеся пра старажытныя абрады, навучыцеся лепш разумець мову прыроды, назіраючы за жывёламі, раслінамі і з'явамі надвор'я.

Выданне для вольнага часу

**Гао Чуньсян, Шао Мінь**

**24 СОНЕЧНЫЯ ПЕРЫЯДЫ: ЗІМА**

Для чытання дарослымі дзецям
Пераклад з англійскай мовы Таццяны Цуканавай
Адказны за выданне Вікторыя Маўчанская

Падпісана да друку 24.02.2021. Фармат 60×90 $^1/_8$. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 5,0. Ул.-выд. арк. 6,5. Тыраж 200 экз. Заказ 335.

ТАА «Новое знание». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/276 ад 23.12.2015. Пр. Пушкіна, д. 15а, Мінск, Рэспубліка Беларусь. Паштовы адрас: а/с 79, 220050, Мінск, Рэспубліка Беларусь. Тэлефон/факс: (10-375-17) 360-20-02; e-mail: nk@wnk.biz; http://wnk.biz

«ГРАДИЕНТ»®. Таварыства з абмежаванай адказнасцю «НАВИТЕХ». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/194 ад 23.02.2017. Вул. Бабушкіна, 6А, 220024, Мінск.

**Original title: This Is the 24 Solar Terms: Autumn**
First Edition 2018

© Dolphin Books Co., Ltd, Beijing, China, 2018
24 Baiwanzhuang Road, Xicheng District, Beijing 100037, China

海豚出版社
DOLPHIN BOOKS
CIPG 中国国际出版集团

All rights reserved.

**ISBN 978-985-24-0246-0**

© Пераклад на беларускую мову. ТАА «Новое знание», 2021



З бавоўны дастаюць насенне




Захоўванне бавоўны



Распушванне бавоўны

Бабуля адзначае, што зіма ў вёсцы значна халадней за зіму ў горадзе. Пасля збору восеньскага ўраджаю бавоўніку яна паабяцала зрабіць для Яі новае паліто, якое не будзе прадзімаць вецер. Цяпер Яя чакае зіму, бо ёй не церпіцца прымерыць новае паліто.





## ПАЛАТНО

Заснежанае поле падобна на вялікае палатно з малюнкамі слядоў. Яя ўважліва разглядае гэта палатно і спрабуе здагадацца, хто ўпотайкі «маляваў» на ім мінулай ноччу.





# ПАЧАТАК ЗІМЫ

Тэмпература падае, дрэвы стаяць голыя, зрэдку ў палях можна ўбачыць маленькіх дзікіх звяроў. Напэўна, іншыя ўжо ўпалі ў зімовую спячку. Тата кажа, што для некаторых халаднакроўных жывёл, напрыклад, для змей і асабліва жаб, сон — надзейны спосаб перажыць суровыя зімовыя месяцы.

Яя заўважае, што ўзімку людзі большую частку часу праводзяць дома. Хіба гэта не падобна на спячку?

# Пачатак зімы

Пачатак зімы выпадае на 7 ці 8 лістапада. Кітайскі іерогліф «зіма» таксама азначае «заканчваць, завяршаць»: у гэты перыяд нарыхтоўваюць сабраны ўраджай, які дагэтуль некалькі дзён сушыўся на сонцы. Гэта час, калі маленькія дзікія звяры вяртаюцца ў свае гнёзды і норы і ўпадаюць у спячку. І, хаця людзі ў спячку не ўпадаюць, у пачатку зімы кітайцы імкнуцца харчавацца сытнай, сілкавальнай ежай, каб супрацьстаяць жорсткім зімовым халадам.




Калі ў дзень пачатку зімы сонечна, зіма будзе марознай, а калі хмарна, зіма чакаецца цёплая.






*Занатуй паказчыкі тэрмометра ў гэты дзень.*



*Найвышэйшая тэмпература* ______ °C



*Найніжэйшая тэмпература* ______ °C

## Снег і дождж

У большасці рэгіёнаў Кітая ў перыяд пачатку зімы рэзка выпадаюць разнастайныя ападкі: ад дажджу і мокрага снегу, да снегу з градам. Трымаецца нізкая тэмпература, але яна можа знянацку павышацца. У атмасферы накопліваюцца забруджвальныя рэчывы і ўтвараюць моцны туман альбо лёгкую смугу.





# МАЛЫ СНЕГ

«Калі не сабраць ураджай гародніны да малога снегу, ён увесь змерзне», — распавядае дзядзуля і спускаецца разам з іншымі ў глыбокі прасторны склеп, напоўнены гароднінай. Пекінская капуста лепш за ўсё захоўваецца, калі яе скласці пірамідай, таксама павінны быць адмысловыя месцы для захоўвання бульбы, ямсу, часнаку і іншай гародніны, якой будзе сілкавацца ўся сям'я на працягу зімы.

# Малы снег

Малы снег выпадае на 22 ці 23 лістапада. Назва гэтага сонечнага перыяду азначае пачатак снегу і яго колькасць. Надвор'е ў гэты час халоднае і сухое. Зіма толькі ўсталёўваецца на поўночнай частцы паўднёвага Кітая, у той час як поўнач ужо сутыкаецца з моцным халодным фронтам, такім чынам, першы снег звычайна выпадае ў паўночным Кітаі. Гэта пароша — невялікія плямкі снегу, якія неўзабаве тае, не пакідаючы слядоў. Снегапады падчас малога снегу надзвычай карысныя для сельскагаспадарчых культур.




Хаця снегапады ў перыяд малога снегу невялікія, яны вельмі карысныя для палеткаў.






*Занатуй паказчыкі тэрмометра ў гэты дзень.*




*Найвышэйшая тэмпература* ______ °C




*Найніжэйшая тэмпература* ______ °C

## Час уцяпляцца

Надыход моцнага халоднага фронту ў перыяд малога снегу прыводзіць да таго, што тэмпература паветра на большай частцы тэрыторыі паўночнага Кітая падае ніжэй за 0 °C. Такім чынам, у гэты самы засушлівы перыяд году, снегапады надзвычай важныя. І, хаця іх выпадае зусім трошкі, гэта нагадвае людзям пра тое, што варта больш цёпла апранацца і захоўваць цяпло. А для садаводаў гэта знак: прыйшоў час засцерагчы дрэвы ад марозаў.





# МАЛЫ ХОЛАД

Яя з татам шпацыруюць па снезе і адчуваюць прыемны пах ад вялікага куста хімананта. Чым бліжэй яны падыходзяць, тым мацнейшым робіцца водар.



# МАЛЫ ХОЛАД

Яя з татам шпацыруюць па снезе і адчуваюць прыемны пах ад вялікага куста хімананта. Чым бліжэй яны падыходзяць, тым мацнейшым робіцца водар.

# Малы холад

Малы холад здараецца паміж 5 і 7 студзеня. З гэтым перыядам надыходзяць найбольш халодныя дні года. Па метэаралагічных дадзеных тэмпература паветра ў перыяд малога холаду звычайна ніжэй за тэмпературу падчас вялікага холаду. Кітайская прымаўка кажа: «Найхаладнейшыя дні здараюцца падчас трэцяга дзевяцідзённага перыяду ад зімовага сонцастаяння (што акурат выпадае на канец малога холаду)». Малы холад азначае, што прышоў апошні перыяд месяцовага календара.




Праточная вада замярзае падчас малога і вялікага холаду.






*Занатуй паказчыкі тэрмометра ў гэты дзень.*




*Найвышэйшая тэмпература* ______ °C




*Найніжэйшая тэмпература* ______ °C



## Перадухіленне шкоды ад прымаразкаў

Нізкія тэмпературы падчас малога холаду могуць пашкодзіць пасевы і дрэвы. Садаводы страсаюць снег з пладовых дрэў, каб не даць галінам змерзнуць і абламацца.

### Песня пра дзевяць перыядаў

Падчас першага і другога перыядаў трымай рукі накрытымі;

Падчас трэцяга і чацвёртага перыядаў кроч па лёдзе;

Падчас пятага і шостага перыядаў глядзі, як зеляненюць вербы;

У сёмы перыяд растаюць рэкі;

У восьмы перыяд вяртаюцца дзікія гусі;

І ў дзявяты перыяд быдла пачынае працаваць у полі.

## Дзевяць зімовых перыядаў

Старажытныя кітайцы падзялілі дні пасля зімовага сонцастаяння і да надыходу вясны на дзевяць перыядаў, у кожным з якіх па дзевяць дзён. Па прашэсці гэтых дзён надвор'е робіцца цяплейшым і пухнатыя коцікі вярбы, нібы снег, разносяцца па гарадскіх дарогах і ўзбочынах. Існуе вядомая народная песенька, у якой пяецца пра гэтыя дзевяць перыядаў.

### Тры хоў зімовага сонцастаяння

Падчас першага *хоў* земляныя чарвякі ўсё яшчэ спяць, скруціўшыся.

Падчас другога *хоў* алень *мілу* скідае свае рогі.

Падчас трэцяга *хоў* пачынаюць цячы вясеннія ручаі.

## Квітнее камелія

Лісце камеліі тоўстае, бліскучае, светла-зялёнага колеру. На фоне вялікага дыску кветкі з яркімі пялёсткамі яны выглядаюць вельмі вытанчана. Існуе каля 2 тыс. відаў гэтай экзатычнай, традыцыйна дэкаратыўнай кветкі, якую любяць ва ўсім свеце.



## Алені *мілу* скідаюць свае рогі

Кітайцы ўспрымаюць аленя *мілу* як несамавітую жывёлу, што мае галаву каня, рогі аленя, асліны хвост і капыты каровы. Гэты від некалі быў на мяжы вымірання. Самцы мілу скідаюць свае рогі падчас зімовага сонцастаяння, але да наступнага лета ў іх вырастуць новыя.





## Робім цзяоцзы

Па традыцыі кітайцы ядуць цзяоцзы ў дзень зімовага сонцастаяння. Са старажытных часоў людзі надавалі гэтаму дню такое ж важнае значэнне, як і святу Вясны. У адрозненні ад месяцовага кануна Новага года — «*cisui*», які азначае развітанне з сыходзячым годам, словам «*tiansui*» называюць канун зімовага сонцастаяння, і гэта літаральна азначае «стаць на год старэйшым». Такім чынам, хаця месяцовы Новы год яшчэ не настаў, людзі ўжо сталі старэйшымі на год. Менавіта ў гэты дзень сем'і на поўначы Кітая збіраюцца разам, каб рабіць цзяоцзы, і кожны член сям'і мае адмысловае заданне. Хтосьці замешвае цеста, хтосьці раскручвае абгорткі для цзяоцзы, а нехта чысціць часнок для соусу, у які будуць макаць клёцкі. Калі сям'я збіраецца разам, каб есці цзяоцзы, уся хата напаўняецца цеплынёй, гоманам і смехам.

## Адлічваем дні да вясны

У старажытныя часы кітайцы прыдумалі, як адсачыць пераход ад зімы да вясны. Яны малявалі дзевяць кветак слівовага дрэва, у кожнай кветкі было па дзевяць пялёсткаў, і зафарбоўвалі штодня пасля зімовага сонцастаяння па адным пялёстку. Калі ўсе дзевяць пялёсткаў у дзевяці кветак былі зафарбаваныя, гэта азначала, што зіма скончылася.



*Малюнак для адліку дзён да пачатку вясны*

## Ласункі для гурманаў

Раней зімоваму раўнадзенству надавалі надзвычай важнае значэнне і гатавалі ў гэты дзень адмысловыя стравы. Гэта традыцыя падтрымліваецца і ў нашыя дні. На поўначы Кітая гатуюць цзяоцзы, а ў паўднёвай правінцыі Фуцзянь ядуць качку з імбірам. Традыцыйная страва гэтай пары года ў ніжнім басейне ракі Янцзы — клейкі рыс, прыгатаваны на па́ры, у Шанхаі — тан'юань (шарыкі з клейкай рысавай мукі з салодкім начыннем), а на Тайвані — пірог з клейкага рысу.



*Цзяоцзы*



Качка з імбірам



Клейкі рыс на па́ры з чырвонай фасоллю



*Тан'юань*



Нарцыс

## Безліч нарцысаў

Сваёй вялікай і мясістай цыбулінай сферычнай формы нарцыс нагадвае часнок альбо цыбулю, таму яго яшчэ называюць «вытанчаным часнаком» альбо «нябесна-зялёнай цыбуляй». Нарцысы лёгка вырошчваць. Дакладна правераны спосаб: пакласці восенню цыбулінку ў чыстую ваду. Калі ёй будзе дастаткова святла і тэмпература паветра будзе спрыяльнай, цыбуліна прарасце ўзімку.

### Тры хоў малога снега

Падчас першага *хоў* знікае вясёлка.

Падчас другога *хоў* павялічваецца энэргія ян (мужчынская) і памяншаецца энэргія інь (жаночая).

Падчас трэцяга *хоў* дрэннае надвор'е ставарае цяжкія дарожныя ўмовы.



## Дагляд за дрэвамі ўзімку



Калі тэмпература паветра падае, садаводы звычайна абмотваюць ствалы сваіх пладовых дрэў саламянымі вяроўкамі, каб уратаваць іх ад марозаў.

Ствалы такіх дрэў, як таполя і вярба, пакрываюць пабелам на метр ад каранёў. На гэта ёсць дзве прычыны. Па-першае, тонкі слой пабелу забівае грыбок і бактэрыі, а таксама шкоднікаў, якія жывуць на дрэвах. Па-другое, непакрытыя пабелам ствалы ўбіраюць у сябе шмат сонечнага святла на працягу дня, але ноччу тэмпература рэзка падае, таму ствол становіцца ўразлівымі да абмаражэння. Абельванне дапамагае ствалу адлюстроўваць ад 40 да 70 % сонечнага святла, дзякуючы гэтаму не адбываецца рэзкага перападу тэмпературы паміж днём і ноччу і ствол не расколваецца.

### Збожжасховішча



Разнастайнае збожжа і гародніна, сабраныя ўвосень, зараз мусяць быць захаваныя. Радыс, бульбу, батат, пекінскую капусту, зялёную кітайскую цыбулю і гарбузы памяшчаюць у склеп, а збожжа добра праветрываюць, высыпаюць у мяхі і захоўваюць у збожжасховішчы.





### Завірухі

Завірухі з'яўляюцца пры моцным ветры і снезе і звычайна адбываюцца пасля некалькіх снегападаў. Калі завеі налятаюць на свежы, яшчэ не ўшчыльнены снег, неба ператвараецца ў шырокую белую прастору. Моцны вецер — асноўная прычына завей. Яны часта здараюцца ў жывёлагадоўчых раёнах паўночнага Кітая.

### Марынады

Кітайская прымаўка кажа: «Марынуй пенкінскую капусту падчас малога снегу, а еш падчас вялікага». У кожнай сям'і ў перыяд малога снегу нарыхтоўваюць прадукты, якія лёгка захоўваць зімой, напрыклад, марынаваную пекінскую капусту, радыс, а таксама робяць кілбасы і бекон.



Бекон



Марынаваная пекінская капуста



Кілбасы



Марынаваны радыс



# ВЯЛІКІ СНЕГ

Раніцай Яя прачнулася і вельмі здзівілася: звонку ляжаў шырокі тоўсты снежны полаг, ён пакрыў сабой усё наваколле. Дах хлява абрынуўся пад вагай снегу, і брат Яі акурат чыніў яго. Яя падавала брату патрэбныя інструменты, а потым пайшла гуляць у снежкі з сябрамі.

# Вялікі снег

Перыяд вялікага снегу выпадае на 6, 7 альбо 8 снежня. У адрозненні ад малога снегу, калі зямлю толькі злёгку запарошвае, у гэты час ідуць моцныя снегапады і тэмпература паветра значна паніжаецца. Агульнае зніжэнне колькасці ападкаў робіць клімат па ўсёй краіне даволі сухім.




Моцныя снегапады даюць спадзеў на ўраджайны год.






*Занатуй паказчыкі тэрмометра ў гэты дзень.*



*Найвышэйшая тэмпература* ______ °C



*Найніжэйшая тэмпература* ______ °C

## Снег паўсюль

Падчас перыяду вялікага снегу бываюць наступныя прыродныя з’явы: снегапады, мокры снег, імжа і смуга — яны ператвараюць поўнач Кітая ў зямлю льда і снегу.



## Сняжынкі

У перыяд вялікага снегу найпрыгажэйшымі «кветкамі» ў паўночным Кітаі з'яўляюцца сняжынкі. Ты калі-небудзь разглядаў іх? Часам сняжынкі складаюцца са снежных кропелек альбо падаюць вялікімі камякамі. Іншы раз яны шасцікутнай формы, падаюць павольна, як гусіны пух. Аматары сняжынак і навукоўцы разглядзелі і апісалі шмат разнастайных відаў сняжынак па ўсім свеце і дакладна вызначылі не менш за 20 тыс. узораў. Як сняжынкам удаецца ствараць так шмат формаў? Гэта звязана з атмасферай воблака, у якім з'яўляюцца сняжынкі, зменамі тэмпературы, вільготнасцю і плынямі паветра, з якімі крышталікі снегу сустракаюцца падчас свайго падарожжа ў верхніх слаях атмасферы.



Сняжынка ў форме ігольчатай зоркі



Сняжынка ў форме пласцінкі



## Выпадзенне своечасовага снегу абяцае ўраджайны год

Акрамя таго, што снег дзейнічае як «коўдра», ахоўваючы азімую пшаніцу ад холаду, ён змяшчае шмат нітрыдаў, якія будуць сілкаваць глебу пасля таго, як снег растае. Таксама снег не дазваляе перажыць зіму яйкам гельмінтаў, замарожваючы іх да смерці.

**Тры хоў вялікага снегу**

Падчас першага *хоў* птушкі гедан не спяваюць.

Падчас другога *хоў* у тыграў шлюбны сезон.

Падчас трэцяга *хоў* прарастаюць карані траў.

## Птушкі *гедан* перастаюць спяваць

Падчас вялікага снегу птушкі *гедан* не спяваюць. Насамрэч, *гедан* зусім не птушка, а сысун, якога яшчэ называюць палятухай. Яна мае лятальную перапонку, альбо патагіум, — пухнатую, падобную да парашута мембрану, якая цягнецца ад запясця да шчыкалаткі і дазваляе жывёле пералятаць з дрэва на дрэва.



Гедан



## Лепім снежныя камы

Ці ведаеш ты, што не з любога снега можна скатаць вялікі ком? Навуковы факт: толькі тыя сняжынкі, якія ўтварыліся пры ўмерана нізкіх тэмпературах могуць склейвацца. Тыя, што выпадаюць у халаднейшыя дні, не такія вялікія і згуртаваныя, каб з іх можна было зляпіць вялікі ком.

У наступны раз, як убачыш снег, паспрабуй зляпіць снежны ком і паглядзі, наколькі вялікім ён атрымаецца.

## Гуляем у снежкі

Дзеці любяць гуляць у снежкі, ладзіць снежныя бойкі і катацца на лыжах на свежым паветры. Гэтыя віды дзейнасці карысныя для цыркуляцыі крыві і дапамагаюць не змерзнуць на вуліцы.





## Ядзім смажаны батат

На вуліцы марозна, але ў доме цёпла і сытна. Сям'я збіраецца разам вакол печкі і смажыць батат.





# ЗІМОВАЕ СОНЦАСТАЯННЕ

Традыцыя падаваць на стол цзяозі ў дзень зімовага сонцастаяння захоўваецца ў памяць аб знакамітым лекары кітайскай медыцыны часоў дынастыі Хань Чжан Чжунцзыне (150–215 г. н. э). Па легендзе была сцюдзёная зіма, калі Чжан звольніўся са сваёй пасады і вярнуўся ў родныя мясціны. Ён заўважыў, што ў людзей з яго мястэчка былі абмарожаныя вушы. Засмучаны гэтым, лекар прыгатаваў адмысловае начынне для клёцак цзяозі, якія вырабляюць у форме вуха, зварыў іх у велізарным рондалі ды раздаў мясцовым жыхарам. Лекавыя травы ў складзе гэтай смачнай і сытнай стравы загаілі абмарожаныя вушы людзей. Я глядзіць, як бабуля робіць цзяозі, і сама лепіць некалькі штук у выглядзе вушак.







# Зімовае сонцастаянне

Зімовае сонцастаянне выпадае паміж 21 і 23 снежня. Гэта адзін з асноўных сонечных перыядаў, падчас якога адзначалі свята Зімы, альбо Фестываль Чанчшы. У гэты дзень сем'і прыносілі ахвяраванні памерлым продкам. Зімовае сонцастаяне адбываецца, калі Сонца знаходзіцца непасрэдна над Тропікам Казярога. У гэты час самы кароткі светлавы дзень у годзе і самая доўгая ноч у паўночным паўшар'і.






Найхаладнейшыя дні прыходзяць пасля зімовага сонцастаяння.




*Занатуй паказчыкі тэрмометра ў гэты дзень.*




*Найвышэйшая тэмпература* ______ °C




*Найніжэйшая тэмпература* ______ °C




## Астранамічны феномен

У паўночным паўшар'і дзень зімовага сонцастаяння самы кароткі, а ноч — сама доўгая ў годзе. Каля 22 гадзін можна ўбачыць, як коўш сузор'я Вялікай Мядзведзіцы паказвае на поўнач.



## Вада пачынае замярзаць

Калі тэмпература падае, зямля на поўначы замярзае і робіцца цвёрдай, а на рэках і азёрах утвараецца тонкая ледзяная скарынка. На поўдні гэта час збіраць восеньскі ўраджай і араць зямлю, каб паспець пасадзіць азімую пшаніцу.

**Тры хоў пачатку зімы**

Падчас першага *хоў* пачынае замярзаць вада.

Падчас другога *хоў* пачынае ледзянець зямля.

Падчас трэцяга *хоў*, згодна з павер'ем фазаны ныраюць у раку і ператвараюцца ў малюскаў.

## Зімовая спячка

Для некаторых дзікіх звяроў спячка — надзейны спосаб перажыць зімовыя маразы і недахоп ежы. Тэмпература цела халаднакроўных жывёл, такіх як змеі і жабы, паніжаецца аднachasова з тэмпературай наваколля, і яны знерухомліваюць да здранцвення. Некаторыя цеплакроўныя жывёлы, такія як вожыкі, таксама ўпадаюць у спячку. Яны скручваюцца ў клубок у цёплых норах і спяць усю зіму. У такім стане вожыкі могуць пражыць без ежы і з малой колькасцю паветра доўгі час, бо вельмі рэдка дыхаюць.

А якіх жывёл, што ўпадаюць у спячку, ведаеш ты?





## Квітнеюць архідэі

Архідэю, кітайскую сліву, бамбук і хрызантэму называюць «чатырма джэнтльмэнамі» саду. Архідэям патрэбны цень, таму яны часта растуць у далінах. Сваім бліскучым, вытанчаным лісцем і элегантнымі, злёгку афарбаванымі пялёсткамі, якія выпраменьваюць свежы водар, яны нагадваюць постаць сціплага джэнтльмэна. Некаторыя са шматлікіх разнавіднасцяў архідэй, напрыклад, халоднарослы цымбідыум, квітнеюць у пачатку зімы, і чым ніжэйшая тэмпература паветра, тым мацнейшы іх водар. Для старажытных кітайцаў архідэя ўвасабляла сабой эстэтычную дасканаласць, а таксама атаесамлялася з радасцю сапраўднага сяброўства.



Архідэі



## Трэба саграваццa

Кожная сям'я мусіць падрыхтавацца да надыходу зімы. Людзі распальваюць печы у дамах. А на вуліцы іх аберагаюць ад халадоў мягкія свежапашытыя паліто. Нават у свойскай жывёлы, коней, авечак і сабак — футра становіцца больш грубым, каб супрацьстаяць зімоваму холаду. Быдла адпачывае ў хлеве, а коні — ў стайні, дзе гаспадары злажылі ім для ежы дадатковае сена. Стайні, авечнікі, сабачыя будкі і куратнікі трымаюць закрытымі, каб туды не трапляў ледзяны вецер.





## Абрэзка дрэў

Шматлікія садовыя дрэвы таксама засынаюць на зіму. Гэта дае магчымасць садаводам трохі абрэзаць дрэвы, прарадзіць іх, зрэзаўшы сухое галлё, старыя і пашкоджаныя галінкі. Пасля абрэзкі паляпшаецца доступ сонечнага святла і паветра да галін, па іх лягчэй рухацца пажыўным рэчывам, якія адганяюць шкоднікаў і дапамагаюць супрацьстаяць хваробам, — усё гэта дазваляе дрэвам вырасціць лепшыя і смачнейшыя плады. Розныя садовыя дрэвы патрабуюць розных відаў абрэзкі ў адпаведнасці са сваёй формай і ўзростам.





## Сарокі будуюць гнёзды

Звычайна сарокі будуюць гнёзды на галінах вялікіх дрэў непадалёк ад чалавечага жытла. Гэты занятак займае ў іх некалькі месяцаў. Птушкам патрэбны гэты час, каб пераканацца: усё ў поўнай гатоўнасці для таго, каб яны змаглі высядзець у ім свае яйкі ў надыходзячым годзе. Яны лятаюць туды-сюды да кроны выбранага дрэва і прыносяць у дзюбах палачкі, гліну, пер'е, поўсць жывёл — усё тое, з чаго яны будуюць каркас гнязда, і хварасціны, якімі яны абкладаюць гняздо звонку. Пабудова цёплага надзейнага гнязда можа заняць да чатырох месяцаў.

### Тры хоў малога холаду

Падчас першага *хоў* дзікія гусі адлятаюць на поўнач.

Падчас другога *хоў* сарокі пачынаюць віць гнёзды.

Падчас трэцяга *хоў* самцы фазанаў пачынаюць клекатаць.



Кветка кітайскай слівы



Кветка хімананта

## Хутка спее хіманант хуткаспелы

Ці ведаеце вы, што кітайскі іерогліф «la» у словах «*lamei*» (хіманант) і «*lazhu*» (свечка) абазначае адно і тое ж, а менавіта «воск»? Гэта таму, што бутоны хімананта гладкія і шчыльныя, нібыта іх паверхня пакрытая слоем воска. Шмат хто памыляецца ў напісанні іерогліфа «la» у слове «*layue*» (назва дванаццатага месяца месяцовага календара), таму што лічаць, што хіманант квітнее ў гэтым месяцы. Насамрэч цвіценне хімананта цягнецца больш, чым апошні месяц па месяцовым календары. Таксама гэтая кветка адрозніваецца ад кветкі кітайскай слівы, якая квітнее раней. Іншыя адрозненні заключаюцца ў наступным: хіманант належыць да сямейства калікантавых, а сліва — да ружакветкавых; пялёсткі хімананта жоўтыя і цвёрдыя, у той час як кветкі слівы пярэстыя і мяккія; водар хімананта мацней за водар кветкі слівы.



Хіманант

## Гульні са снегам

Калі ўсё навокал агорнутае белай коўдрай, дзецям у радасць гуляць на снезе ды ляпіць снежныя фігуры. Можна зрабіць невялікія санкі з драўлянай дошкі, прымацаваўшы вяроўку да аднаго боку: хтосьці сядзіць на санках, іншы цягне, астатнія штурхаюць. Потым можна памяняцца месцамі.



## Каша *лаба*

Свята *Лаба* — галоўная падзея падчас малога холаду. На восьмы дзень дванаццатага месяца па месяцовым годзе (то бок на *Лабу*) ў кожным доме гатуюць кашу *лаба*. У некаторых рэгіёнах існуе таксама традыцыя рабіць марынаваны часнок *лаба*. Гэта нескладана, паспрабуй! Ты здзівішся, калі ўбачыш, як змяняецца колер часнаку пасля таго, як ён памарынуецца ў воцаце. Існуе шмат легенд аб паходжанні *свята Лаба*. Некаторыя лічаць, што ў гэты дзень Шак'ямуні (Гаутама) стаў Будай. Іншыя мяркуюць, што ў гэты дзень ушаноўваюць памяць Юэ Фэя (1103–1142), знакамітага кітайскага палкаводца дынастыі Паўднёвай Сун. Бацькі і дзяды могуць расказаць шмат гісторый пра карані *свята Лаба*.

## Песня свята Вясны

Бадзёрая і ўзнёслая атмасфера вясенняга свята адчуваецца паўсюль з надыходам Лабы (восьмага дня апошняга месяцовага перыяду). У *песні пра свята Вясны* пералічаюцца традыцыі і абрады найбольш важнага кітайскага фестывалю.

Новы год крочыць за Лабай.

Еш кашу *лаба* яшчэ некалькі дзён, да 23-га дня апошняга месяцовага перыяду, тады бацькі набудуць табе соладавую цукерку.

На 24-ы дзень людзі прыбіраюць хаты і рыхтуюць іх да вясны.

На 25-ы дзень усе робяць тофу.

На 26-ы дзень кожная сям'я набывае свініну.

На 27-ы дзень людзі ходзяць у краму за новай вопраткай.

На 28-ы дзень ставяць цеста на закваску.

На 29-ы дзень гатуюць булачкі на па́ры.

У канун Новага года рыхтуйся не спаць усю ноч.

А ў дзень Новага года танцуй, каб святкаваць яго надыход.



Каша *лаба*



Часнок *лаба*

Марынаванне часнака *лаба*






1. Ачысці часнок.



2. Пакладзі яго ў шклянку і залей воцатам.



3. Закрый шклянку да таго часу, пакуль часнок не стане зялёным. Тады яго можна есці. Воцат са шклянкі можна дадаваць у халодныя закускі альбо выкарыстоўваць як соус для *цзяозы*.

# Вялікі холад






Дваццаць трэці дзень апошняга месяцовага перыяду вядомы як пярэдадзень свята. У гэты дзень на кірмашах і рынках безліч народу, бо ўсе купляюць пачастункі на свята Вясны. Бабуля распавядае Яі, што гэты дзень называюць яшчэ святам кухоннага бога: людзі прыбіраюць хаты, ласуюцца соладавымі ледзяшамі ды прыносяць ахвяраванні богу кухні, спадзеючыся, што ён у гэтым годзе, падняўшыся на неба, распавядзе Нефрытаваму імператару толькі добрае пра зямныя справы гэтай сям'і. Усе абменьваюцца ўзаемнымі пажаданнямі дабрабыту і шчаслівага новага года.

# Вялікі холад

Вялікі холад, апошні з 24-х сонечных перыядаў, здараецца з 19 па 21 студзеня. Тэмпература ўсё яшчэ вельмі нізкая, а снег на зямлі ледзянее. Але неўзабаве пасля вялікага холаду прыходзіць свята Вясны. Такім чынам, гэты сонечны перыяд прасягнуты чаканнем Новага года і часу, калі сям'я збярэцца разам.

Назвы перыядаў малая спёка, вялікая спёка, канец спёкі, малы холад і вялікі холад адлюстроўваюць змены тэмпературы паветра і ўзровень спёкі альбо холаду ў розныя пары года. Пасля вялікага холаду пачынаецца новы цыкл сонечных перыядаў.






Пасля вялікага холаду пачынаецца новы год.




*Занатуй паказчыкі тэрмометра ў гэты дзень.*




*Найвышэйшая тэмпература* ______ °C




*Найніжэйшая тэмпература* ______ °C

## Ну і мароз!

Моцныя снегапады звычайна выпадаюць у перыяд вялікага холаду і часта суправаджаюцца суровым ветрам і паніжэннем тэмпературы. Калі збіраешся на вуліцу, лепей добра ахінуцца: апрануць паліто, шарф. І не забудзься на пальчаткі, каб не абмарозіць рукі.





## Драпежныя птушкі палююць

Кветкі і расліны, птушкі і звяры — ўсе паводзяць сябе ў адпаведнасці з порамі года. Іх паводзіны лічацца адметнымі прыкметамі сонечных перыядаў. У вялікі холад такія драпежныя птушкі як арлы і сокалы, вельмі ахвотна палююць: яны лунаюць у небе і высочваюць з вышыні здабычу, якая дасць ім дастаткова энергіі, каб вытрываць маразы.

### Тры хоў вялікага холаду

Падчас першага *хоў* квахтухі наседжваюць яйкі.

Падчас другога *хоў* драпежныя птушкі палююць на здабычу.

Падчас трэцяга *хоў* сярэдзіна ракі моцна замярзае.

## Купанне ў палонках

«Падчас трэцяга і чацвёртага перыядаў кроч па лёдзе». Канькабежцаў прываблівае тоўсты і гладкі лёд на рэках. Таксама ў гэты час некаторыя смельчакі прарубаюць у лёдзе палонкі і скачуць туды, каб пакупацца. Даследаванні сцвярджаюць, што пры пэўнай падрыхтоўцы рэгулярнае плаванне ў палонках не толькі аслабляе трывогу і ўзмацняе здольнасць супрацьстаяць холаду, а таксама паляпшае мікрацыркуляцыю цела, узмацняючы гэтым імунную сістэму.



## Квітнее хіманант

З набліжэннем свята Вясны, нягледзячы на сцюдзёны вецер і снежныя сумёты, у палях паўднёвых рэгіёнаў пачынаюць з'яўляцца кветкі хімананта. На поўначы Кітая тым часам хіманант, які расце ў гаршчках, таксама зацвітае і распаўсюджвае свой выразны водар. Пазней на яго галінках з'явіцца і раскрыецца маладое лісце. Хіманант разам з хвояй і бамбукам называюць трыма сябрамі зімы. Калі кажуць «*mei*», могуць мець на ўвазе як хіманант, так і кітайскую сліву. Хіманант знакаміты сваімі выбітнымі кветкамі і водарам, а сліву саджаюць з большага дзеля пладоў. Кансерваваныя слівы любяць па ўсёй краіне.



## Уборка і пакупкі да свята Вясны

Надыходзіць Новы год, і ўсе занятыя падрыхтоўкай да яго. У кожнага члена сям'і сваё заданне, напрыклад, прыбраць усю хату ад столі да падлогі і развесіць на вокнах чырвоныя выразанкі. Таксама людзі ходзяць на кірмашы ці ў гандлёвыя цэнтры і купляюць там ліхтары, скруткі з вясновымі вершамі, петардамі і новай вопраткай для дзяцей.







## Сакрэты на прагалінах

Зямля пад снегам награваецца на зімовым сонцы, нібы пад вялікай ваўнянай коўдрай і, калі цёплыя сонечныя промні прыўздымуць край снежнай коўдры, пад ёй можна ўбачыць зялёныя парасткі азімай пшаніцы. Ці магчыма гэта, каб вясна прыйшла раней, чым скончылася зіма?



## Надыход Новага года

Кожны, хто старанна працаваў у сыходзячым годзе, сустракае надыход Новага года з усмешкай на твары. Мінулі пачатак зімы, малы снег, вялікі снег, зімовае сонцастаянне, малы і вялікі холад, а значыць, усе тры зімовыя месяцы прайшлі. Вялікі холад — апошні з дваццаці чатырох сонечных перыядаў.

Але перад тым, як холад сыйдзе канчаткова, у прыхаваных цяністых закутках і расколінах квітнее зімовы язмін. А потым зноў прыходзіць вясна і цыкл з дваццаці чатырох сонечных перыядаў пачынаецца зноў.




## Хто атрымае залатую сняжынку?

Правілы гульні: Два гульцы выходзяць на поле з дзвюх сцежак: сцежка А і сцежка Б, ды запісваюць назвы сямі з'яў, якія ім сустракаюцца на шляху. Хто правільна запіша іх першым, атрымае залатую сняжынку з малюнка нумар 7.














Існуе чатыры пары года. Старажытныя кітайцы падзялілі іх на 24 сонечныя перыяды, кожны з якіх адлюстроўвае адметную фазу сезонных зменаў. Сонечныя перыяды не толькі падказваюць, што трэба рабіць земляробам, але і дапамагаюць кожнаму з нас прадбачыць змены надвор'я.

Гэта кніга апавядае гісторыю дзяўчынкі Яі, якая наведвае сваіх бабулю і дзядулю ў вёсцы і назірае, як 24 сонечныя перыяды паступова змяняюць адзін аднаго на працягу года. Разам з Яяй вы трапіце на традыцыйныя кітайскія святы, даведаецеся пра старажытныя абрады,



EAC

www.wnk.biz

sale@wnk.biz

ISBN 978-985-24-0246-0